7. *Сцяцко, У. П.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск : Выш. шк., 1990. – 222 с.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1978. – Т. 2 : Г – К. – 768 с.
9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1980. – Т. 4 : П – Р. – 768 с.

*Л. П. Леська (Беларусь)*

# МАДЫФІКАЦЫІ АРХЕТЫПА «КУЛЬТУРНЫ ГЕРОЙ» У МІФАПАЭТЫЧНАЙ КАСМАГОНІІ Я. БАРШЧЭЎСКАГА

Мастацкая касмагонія працяглы час не магла стаць прадметам спецыяльнага даследавання, існаваў неадольны разрыў паміж філасофскай эстэтыкай і літаратурнай навукай. Касмагонія як рэлігійна-міфалагічнае ўяўленне пра ўзнікненне свету і яго далейшае развіццё даследавалася філасофскай думкай, касмалогія – астраноміяй. Матэрыялістычная эстэтыка, ідэалогія і аксіялогія не вывучалі рэлігійна-міфалагічных праблем, такія пытанні не маглі быць на той час прадметам акадэмічнай навукі. Рэлігійныя ідэі разглядаліся павярхоўна, без заглыблення ў сутнаснае. У 1960–1970-я гады паняцце «касмагонія» вывучалася як раздзел астраноміі, які даследуе паходжанне касмічных аб'ектаў і сістэм. І толькі ў канцы 1980 – пач. 1990-х гг. касмагонія атрымала тэрміналагічнае вызначэнне як вучэнне або вераванне пра паходжанне свету і яго эвалюцыю.

У беларускай літаратуразнаўчай навуцы, як слушна заўважыла Т. Шамякіна ў працы «Парадоксы часу, або рамантыка савецкай навукі», вывучэнне касмалогіі, касмагоніі пачалося позна, хаця «ўся наша мастацкая культура дзіўна касмалагічная. Казкі, загадкі, замовы пранізаны касмічнай тэматыкай, імкненнем спазнаць цуд, які прыйдзе з неба» [12, с. 51]. Да вывучэння тэмы космасу, месца чалавека ў Сусвеце першымі ў беларускай літаратуразнаўчай навуцы звярнуліся акадэмікі І. Навуменка [6] і В. Каваленка [3]. І. Навуменка адзначаў, што «Янка Купала і Якуб Колас засталі ў сваім народзе яшчэ амаль не крануты кніжнай апрацоўкай духоўны свет, які сваімі вытокамі меў старажытнае, у пэўнай ступені міфалагічнае светаадчуванне з яго культам неба, сонца, наогул, прыродных сіл, верай у таямнічае і звыштаямнічае, што мае несумненную ўладу над чалавекам» [6, с. 5].

Традыцыі І. Навуменкі, В. Каваленкі ў вывучэнні касмізму, мастацкай касмагоніі і касмаганічных матываў у беларускай літаратуры і культуры развіваюць С. Даніленка [2], С. Санько [7].

С. Даніленка [2] паказаў асноўныя механізмы архаічнай касмагоніі на матэрыяле твораў беларускай літаратуры ХІХ ст. Даследчык вызначыў, што «касмагонія –

гэта рытуальнае вырашэнне перыядычных крызісаў грамадскага жыцця» [2, с. 21]. М. Каржэўская [4] даследавала асобныя аспекты індывідуальнай касмагоніі Я. Баршчэўскага ў артыкулах «Ноч у творах Эрнэста Тэадора Амадэя Гофмана і Яна Баршчэўскага», «Апазіцыя свой / чужы ў творах Э. Т. А. Гофмана і Я. Баршчэўскага». Даследчыца асэнсавала міфалагічную сімволіку «ночы» як знакавага паказчыка наступлення дэманічных сіл Хаосу і як час натхнення і творчай рэалізацыі, раскрыла механізм дзеяння апазіцыі «свой / чужы» ў мастацкіх творах Я. Баршчэўскага. Нягледзячы на першыя падыходы да вывучэння мастацкай касмагоніі ў творах пісьменніка, праблема застаецца да канца не раскрытай.

У аснову міфапаэтычнай касмагоніі Я. Баршчэўскага пакладзены пафас архаічнай міфалогіі, які заключаўся ў ператварэнні безаблічнага Хаосу ва ўпарадкаваны Космас дзякуючы дзейнасці культурнага героя-дэміурга. Яго мадыфікацыяй у мастацкіх тэкстах са зборніка «Шляхціц Завальня» выступаюць вобразы гаспадара, музы́кі.

Даследаванне вобраза культурнага героя знайшло ўвасабленне ў працах У. Тапарова [10], Е. Меляцінскага [5]. Апошні станоўча ахарактарызаваў дзейнасць культурнага героя, які здабывае для людзей прадметы культуры (агонь), прыносіць у іх жыццё разнастайныя даброты, вучыць іх рамёствам, мастацтвам. Культурны герой, паводле бачання вучонага, – актыўны ўдзельнік касмаганічных міфаў. Ён займаецца ўпарадкаваннем навакольнага свету, але гэтымі дзеяннямі нельга абмежаваць яго ператваральны патэнцыял, які, паводле слушнай думкі М. Эліадэ [13], стаў узорнай мадэллю для шматстайных творчых праяў, адной з якіх можа быць паэтычная або музычная дзейнасць.

Першапачаткова вобраз культурнага героя ў беларускай традыцыі, як заўважыла Т. Сухоцкая, «існуе ў розных раслінных, зааморфных і антрапаморфных мадыфікацыях, але найбольш сэнсаваёмкімі з’яўляюцца дзве: вобразы гаспадара і музыкі» [9, с. 214]. Галоўным культурным героем эпасу і каляндарнай паэзіі з’яўляецца дбайны гаспадар, у якім спалучаюцца якасці сейбіта і воіна. Словам «гаспадар» афіцыйна называлі кіраўніка дзяржавы. У рэальнай гісторыі гэтаму ўзору найбольш адпавядаў Вітаўт, вобраз якога апаэтызаваны ў паэме М. Гусоўскага «Песня пра зубра».

Я. Баршчэўскі ў зборніку «Шляхціц Завальня», аповесці «Душа не ў сваім целе» прадставіў адносіны паміж героямі праз сімвалічную мадэль «госць – гаспадар». Вядомы даследчык М. Хаўстовіч падкрэслівае, што беларус не адчувае сябе гаспадаром роднай зямлі, дзе паўсюль валадараць незнаёмцы, дзіўныя людзі, чарнакніжнікі, або «чорныя госці» [11, с. 62]. «Чорныя госці» ўздзейнічаюць на некаторых жыхароў роднай Беларусі, становяцца гаспадарамі над імі, але ў аповесці «Душа не ў сваім целе» актывізуюцца героі-ператваральнікі, гаспадары стновішча. Напачатку гэта «ператваральнік» прыроды Гайнар, заснавальнік незвычайнага саду. У сваёй дзейнасці ён прытрымліваецца важнага прынцыпу – наследавання прыродзе, «ягоны сад, ягоная праца, ягонае наследаванне прыродзе – гэта першая прыступка ў іерархічнай пірамідзе служэння Бацькаўшчыне» [11, с. 188]. Праца

Гайнара стала асновай для дзейнасці таямнічага Рыльца – вучонага-гісторыка, які існуе інкогніта, яго задача ўваскрашаць мінуўшчыну, магчыма, узнаўляць час да падзелу Рэчы Паспалітай, каб мець мажлівасць параўноўваць сучаснасць і мінулае. Мы пагаджаемся з тлумачэннямі М. Хаўстовіча аб тым, што сапраўдныя гаспадары сітуацыі – ператваральнікі, прыродазнаўцы, гісторыкі (аповесць «Душа не ў сваім целе»).

Архетыповы вобраз гаспадара, згодна з міфапаэтычнай канцэпцыяй пісьменніка, прадстаўленай у зборніку «Шляхціц Завальня», мае тры адрозныя значэнні. Па-першае, гэтым найменнем мы называем «гаспадара ўласнай душы і цела» (апавяданні «Стогадовы стары і чорны госць», «Ваўкалак», аповесці «Драўляны Дзядок і кабета Інсекта», «Душа не ў сваім целе»). Па-другое, гаспадаром таксама лічыцца чалавек, які жыве ў гарманічным суладдзі з прыродай, з навакольным светам (апавяданні «Чараўнік ад прыроды і кот Варгін», «Валасы, якія крычаць на галаве»). І, па-трэцяе, гаспадар – уладальнік добраўпарадкаванай гаспадаркі, зямлі (апавяданні «Шляхціц Завальня», «Рыбак Родзька», «Развітанне»).

У апавяданнях «Вужыная карона», «Ваўкалак», «Стогадовы стары і чорны госць», аповесці «Драўляны Дзядок і кабета Інсекта» пісьменнік па-філасофску заглыблена раскрывае эвалюцыю душы чалавека, узаемазвязанасць душы і цела. Згодна з рэлігійным светабачаннем мастака, сапраўдным гаспадаром уласнай душы з'яўляецца глыбока веруючы чалавек. Такім праведнікам быў дзед Гараська – стогадовы стары (апавяданне «Стогадовы стары і чорны госць»), які пражыў жыццё, духоўна ўдасканаліўся і ўжо гатовы перайсці ў царства божае. У прадчуванні гэтага пераходу эфірны двайнік героя Я. Баршчэўскага паўстае перад вяскоўцамі: «…дзверы не адчыняліся, а Гараська стаіць пасярод хаты. Са страхам глядзім на яго. Ён стаіць моўчкі і нерухома, твар яго смутны і выказвае штосьці незразумелае, уся постаць лёгкая і, здаецца, вышэйшая, чым зазвычай. З кожнаю хвілінаю ён робіцца ўвачавідкі лягчэйшы і танчэйшы і растае ў паветры» [1, с. 250]. Эфірны двайнік «стогадовага старога» можа аддзяляцца ад цела, «пашыраючыся ў выглядзе бачнага арэола, або аўры» [1, с. 86]. Існаванне Гараські ў астральным целе – паказчык духоўнай эвалюцыі героя, вынікам якой і стала свабоднае існаванне неабцяжаранай душы.

Такую ж эвалюцыю праходзіць і душа кабеты Інсекты (апавяданне «Кабета Інсекта»). Парушэнне хрысціянскіх запаведзей прывяло жанчыну да інэвалюцыі – яна ператварылася ў насякомае (лац. insekta). Лагічным завяршэннем зваротнай метамарфозы ў фінале апавядання стала абнаўленне гераіні: малітва ачышчае грэшніцу, і яна пераходзіць на новую ступень набліжанасці да Бога, доказам чаго стала яе з'яўленне перад ксяндзом у «пекным абліччы», «падобнай да анёла» [1, с. 296].

Новы воблік Інсекты, як і Маркі (апавяданне «Ваўкалак») – знак Божай усемагутнасці і яго прысутнасці ў жыцці чалавека. Сувязь паміж энергіяй чалавека і Бога ў апавяданні «Ваўкалак» праяўляецца ў развіцці героя не ў формах знешняга росту, а ва ўнутраных новаўтварэннях. Сваім зместам гэты твор падобны

да раннехрысціянскіх жыцій, дзе таксама падаваліся два вобразы чалавека, раздзеленыя і аб'яднаныя крызісам перараджэння: вобраз грэшніка да перараджэння і праведніка, святога пасля яго. У апавяданні «Ваўкалак» пакуты з'яўляюцца лагічнай перадумовай ачалавечвання героя і вядуць яго да эвалюцыйнага росту.

Такім чынам, згодна з рэлігійным светабачаннем Я. Баршчэўскага, гаспадаром сваёй душы выступае праведны чалавек («Стогадовы стары і чорны госць»), які праходзіць праз пакуты і перажывае ўзвышаны момант катарсісу (апавяданне «Ваўкалак»), не стварае для сябе куміра, ушаноўвае памяць аб памерлых продках (апавяданне «Валасы, якія крычаць на галаве»).

## Літаратура


1. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадм. і камент. М. Хаустовіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.
2. *Даніленка, С.* Міф і Радзіма: сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польскага-беларуска рамантызму / С. Даніленка ; рэдкал.: А. М. Ненадавец (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Палібіг, 1999. – 114 с.
3. *Каваленка, В. А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка ; рэд. І. Я. Навуменка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.
4. *Каржэўская, М.* Ноч у творах Эрнста Тэадора Амадэя Гофмана і Яна Баршчэўскага / М. Каржэўская // Літаратуразнаўства. Этналогія : матэрыялы IV Міжнар. кангр. беларусістаў «Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапейскіх краін», Мінск, 6–9 чэрв. 2005 г. / Міжнар. асац. беларусістаў ; пад рэд. І. Багдановіч, Т. Валодзінай. – Мінск, 2010. – С. 88–90.
5. *Мелетинский, Е. М.* О литературных архетипах / Е. М. Мелетинский. – М. : Рос. гос. гуманитар. ун-т, 1994. – 133 с.
6. *Навуменка, І. Я.* Элементы міфалогіі ў паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа / І. Я. Навуменка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 38 с.
7. *Санько, С.* Дуалістычная касмагонія і беларускія рэфлексы індаеўрапейскай блізнячнай міфалогіі / С. Санько // Druvis : альманах. – Мінск, 2011. – № 3. – С. 27–46.
8. *Санько, С. І.* Адзін рэдкі матыў беларускай касмагоніі і касмаганічныя канцэпцыі школы Джайммінія «Самаведы» і позніх орфікаў / С. І. Санько // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2016. – № 2. – С. 10–18.
9. *Сухоцкая, Т. Ф.* Культурны герой у гісторыка-культурным працэсе / Т. Ф. Сухоцкая // Беларусь на скрыжаванні стагоддзяў: ад класікі да су часнасці : да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 1–2 лістап. 2012 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 214–216.
10. *Топоров, В. Н.* Мифология : ст. для мифол. энцикл. : в 2 т. / В. Н. Торопов. – М. : Яз. слав. культуры, 2014. – Т. 1. – 595 с.
11. *Хаўстовіч, М.* На парозе забытае святыні: творчасць Яна Баршчэўскага / М. Хаўстовіч. – Мінск : Права і эканоміка, 2002. – 186 с.
12. *Шамякина,Т .* Парадоксы времени, или Романтика советской науки / Т. Шамякина. – Минск : Четыре четверти, 2015. – 233 с.
13. *Элиаде, М.* Аспекты мифа / М. Элиаде. – М. : Акад. проект, 2001. – 239 с.